Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і абласнога выканаўчага камітэта

Год выдання другі

№ 231 (300) СУБОТА 5 КАСТРЫЧНІКА 1940 г.

Цана 10 капеек.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Створым магутныя дзяржаўныя працоўныя рэзервы СССР

Публікуемыя сёння Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР «Аб Дзяржаўных Працоўных Рэзервах СССР» і пастанова Совета Народных Камісараў Саюза ССР аб утварэнні Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Соўнаркоме СССР, аб прызыве гарадской і калгаснай моладзі ў Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання*) маюць важнейшае дзяржаўнае і народнагаспадарчае значэнне.

«Задача далейшага расшырэння нашай прамысловасці патрабуе пастаяннага прытоку новай рабочай сілы на шахты, руднікі, транспарт, фабрыкі і заводы. Без бесперапыннага папаўнення саставу рабочага класа немагчыма паспяховае развіццё нашай прамысловасці», — гаворыцца ва Ўказе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР. І Ўказ ставіць важнейшую дзяржаўную задачу стварэння дзяржаўных працоўных рэзерваў СССР.

Планавая соцыялістычная гаспадарка азначае, што дзяржава не толькі распараджаецца матэрыяльнымі рэсурсамі і грашовымі сродкамі і размяркоўвае іх у адпаведнасці з народнагаспадарчымі патрэбнасцямі, але і павінна кіраваць таксама планавай падрыхтоўкай, размеркаваннем і выкарыстаннем рабочай сілы. У соцыялістычным грамадстве сістэма падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы, размеркаванне і пераразмеркаванне працоўных рэсурсаў паміж галінамі і сферамі народнай гаспадаркі з'яўляецца важнейшай грамадскай, дзяржаўнай справай, адной з галоўных функцый соцыялістычнай дзяржавы. Без гэтага немысліма планавая гаспадарка. Яшчэ Маркс указаў, што «...планамернае размеркаванне рабочага часу па розных галінах вытворчасці астаецца першым эканамічным законам на аснове калектыўнай вытворчасці».

Ва ўмовах капіталізма размеркаванне рабочай сілы паміж галінамі народнай гаспадаркі, роўна як і падрыхтоўка кваліфікаванай рабочай сілы, адбываецца стыхійным шляхам. Развіццё капіталізма суправаджаецца масавым разбурэннем і абяздоленнем працоўнага сялянства, разбурэннем дробнай буржуазіі ў гарадах, выцясненнем рабочых машынай. Усё гэта стварае для капіталізма пастаянную многамільённую армію беспрацоўных, вымушаных стукацца ў заводскія вароты, як міласці, прасіць работы. Наяўнасць такой пастаяннай рэзервовай арміі працы з'яўляецца адной з асноўных умоў існавання і развіцця буйнай капіталістычнай прамысловасці.

У дарэвалюцыйнай рускай вёсцы сярод сялян налічвалася 65 процентаў беднаты, якая марнела на сваіх жалкіх кавалачках зямлі. Штогод мільёны вясковай беднаты адпраўляліся на заработкі ў горад, ішлі за тысячы вёрст у паўднёвыя раёны, наймаючыся за грашы батрачыць у кулакоў і памешчыкаў. Ганімая голадам, вясковая беднага перапаўняла рынак працы ў прамысловых гарадах і раёнах.

У СССР назаўсёды знішчана беспрацоўе ў горадзе і галеча ў вёсцы. Калгаснікі сталі забяспечанымі людзьмі. Але тым самым закрыты, зніклі старыя крыніцы, якія забяспечвалі стыхійны прыток рабочай сілы ў прамысловасць.

«У нашай краіне поўнасцю знішчана беспрацоўе, назаўсёды пакончана з ніштатой і разбурэннем у вёсцы і горадзе, з прычыны гэтага ў нас няма такіх людзей, якія-б вымушаны былі стукацца і прасіцца на фабрыкі і заводы, стыхійна ўтвараючы, такім чынам, пастаянны рэзерв рабочай сілы для прамысловасці.»

У гэтых умовах перад дзяржавай стаіць задача арганізаванай падрыхтоўкі новых рабочых з гарадской і калгаснай моладзі і стварэння неабходных працоўных рэзерваў для прамысловасці», — гаворыцца ва Ўказе Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Дзяржава павінна забяспечыць сістэматычны прыток неабходнай рабочай сілы ў нашу быстра развіваючуюся прамысловасць. Гутарка ідзе аб расшыраным соцыялістычным узнаўленні кваліфікаванай рабочай сілы. У распараджэнні соцыялістычнай дзяржавы павінны быць магутныя, пастаянна папаўняемыя дзяржаўныя працоўныя рэзервы для прамысловасці, без чаго не можа развівацца соцыялістычная прамысловасць.

Соцыялістычная прамысловасць — база развіцця ўсёй народнай гаспадаркі, кіруючы пачатак ва ўсёй сістэме народнай гаспадаркі. Соцыялістычная індустрыя вядзе ўперад усю нашу соцыялістычную гаспадарку, уключаючы сюды і сельскую гаспадарку, і ўмацоўвае абарону краіны.

Для далейшага росту соцыялістычнай прамысловасці неабходна не толькі забяспечыць пастаянны прыток новых папаўненняў рабочага класа, але і стварыць устойлівую сістэму падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. Масавая падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў ёсць адна з рашаючых умоў росту прадукцыйнасці працы, стварэння багацця прадуктаў, а на гэтай аснове стварэння ўмоў для пераходу да вышэйшай фазы камунізма.

Таварыш Сталін указаў, што «з усіх каштоўных капіталаў... самым каштоўным і самым рашаючым капіталам з'яўляюцца людзі, кадры». Вось чаму такое гістарычнае значэнне мае Ўказ Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, які прадугледжвае штогадовую падрыхтоўку для перадачы ў прамысловасць дзяржаўных працоўных рэзерваў у колькасці ад 800 тысяч да 1 мільёна чалавек шляхам навучання гарадской і калгаснай моладзі пэўным вытворчым прафесіям у Рамесніцкіх Вучылішчах, Чыгуначных Вучылішчах і ў школах Фабрычна-Заводскага Навучання.

Навучанне ва ўсіх гэтых школах будзе праводзіцца бясплатна; навучэнцы ў перыяд навучання будуць знаходзіцца на ўтрыманні дзяржавы.

Выключна важнае значэнне мае пункт Указа Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб тым, што дзяржаўныя рэзервы рабочай сілы знаходзяцца ў непасрэдным распараджэнні Совета Народных Камісараў СССР і не могуць быць выкарыстаны наркаматамі і прадпрыемствамі без дазволу Ўрада. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і размеркаваннем дзяржаўных працоўных рэзерваў утвараецца пры Соўнаркоме СССР Галоўнае Ўпраўленне Працоўных Рэзерваў, маючае свае органы ў рэспубліках, краях, абласцях, у Маскве і Ленінградзе.

Указ устанаўлівае, што «усе скончыўшыя Рамесніцкія Вучылішчы, Чыгуначныя Вучылішчы і школы Фабрычна-Заводскага Навучання лічацца мабілізаванымі і абавязаны працаваць 4 годы падрад на дзяржаўных прадпрыемствах, па ўказанню Галоўнага Ўпраўлення Працоўных Рэзерваў пры Совеце Народных Камісараў СССР, з забеспячэннем ім зарплаты па месцу работы на агульных падставах».

Усе скончыўшыя пералічаныя вучылішчы будуць карыстацца адтэрміноўкамі па прызыву ў Чырвоную Армію і Ваенна - Марскі Флэт на час да скančэння чатырохгадовага тэрміну, абавязковага для работы ў дзяржаўных прадпрыемствах.

Указ абавязвае старшынь калгасаў штогодна выдзяляць у парадку прызыву (мабілізацыі) па 2 чалавекі моладзі мужчынскага полу ва ўзросце 14 — 15 год у Рамесніцкія Вучылішчы і Чыгуначныя Вучылішчы і ва ўзросце 16 — 17 год у школы Фабрычна-Заводскага Навучання на кожныя 100 членаў калгаса, лічачы мужчын і жанчын ва ўзросце ад 14 да 55 год. Гарадскія Советы дэпутатаў працоўных Указам абавязуюцца штогодна выдзяляць у парадку прызыву (мабілізацыі) моладзь у тым-жа ўзросце ў колькасці, штогодна ўстанаўляемай Соўнаркомам СССР.

Да пачатку першага чарговага прызыву ў школы і вучылішчы асталося няммогім больш аднаго месяца. Задачай кожнай партыйнай і комсамольскай арганізацыі з'яўляецца праведзенне вялікай палітыка-масавай работы, якая павінна забяспечыць праведзенне Ўказа, у прыватнасці значны прыток заяў добраахвотна паступаючых у вучылішчы.

У соцыялістычным земляробстве ў рэзультаце механізацыі працы створана велізарная эканомія працоўных рэсурсаў. Выдзяленне некаторай часткі моладзі для падрыхтоўкі кваліфікаваных прамысловых кадраў азначае разам з тым адцягненне з сельскай гаспадаркі свабоднай рабочай сілы і выкарыстанне яе ў вядучых галінах народнай гаспадаркі.

Няма сумнення, што калгасная і гарадская моладзь з вялікай гатоўнасцю адгукнецца на заклік Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР і Совета Народных Камісараў СССР, з радасцю пойдзе ў ствараемыя школы і вучылішчы. Умовы, ствараемыя дзяржавай для гэтай моладзі (бясплатнае навучанне, утрыманне за кошт дзяржавы, набыццё кваліфікацыі), выключна спрыяючыя — такія ўмовы можа стварыць толькі совецкая ўлада.

Справа чэсці калгасаў і гарадскіх Советаў дэпутатаў працоўных— забяспечыць дакладнае выкананне гэтага важнейшага Ўказа і паслаць у вучылішчы і школы лепшую моладзь. Партыйныя, прафсаюзныя і комсамольскія арганізацыі і ўся совецкая грамадскасць павінны шырока папулярызаваць Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета і пастанову Совета Народных Камісараў СССР па пытанню аб стварэнні дзяржаўных працоўных рэзерваў СССР і дабіцца няўхільнага праведзення ў жыццё гэтых рашэнняў.

(Перадавы артыкул «Праўды» за 3 кастрычніка).

---

*) Гэтыя дакументы апублікаваны ва ўчарашнім нумары газеты «Вольная праца».

Хутка і высокаякасна ўбраць бульбу

НЕ ПАКІНУЦЬ У ЗЯМЛІ НІВОДНАГА КЛУБНЯ

Забяспечыць насельніцтва гарадоў і прамысловых цэнтраў бульбай — важнейшая гаспадарчая і палітычная задача. У гэтым годзе калгасы і працоўныя сяляне нашай вобласці ўбіраюць багаты ўраджай. Зараз уся ўвага партыйных, совецкіх арганізацый, зямельных органаў, праўленняў калгасаў павінна быць звернута на тое, каб своечасова і без страт убраць бульбу.

Бульба—культура працаёмкая, яна патрабуе вялікай затраты працы. «Правесці ўборку бульбы, гароднiны і насеннікаў гэтых культур у кароткія тэрміны, да наступлення асенніх замаразкаў»,—так гаворыцца ў пастанове Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Соўнаркома СССР «Аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў». Гэта патрабаванне партыі і ўрада павінна быць выканана. Каб своечасова ўбраць бульбу, трэба арганізаваць работу так, каб ва ўборцы ўдзельнічалі ўсе працаздольныя калгаснікі. Не пакінуць ні адной клубні на полі на зіму—баявая задача ўсіх калгасаў і зямельных органаў. Кіраўнікі раёнаў павінны зразумець, што зацяжка ў уборкай пагражае велізарнымі стратамі бульбы.

Асобныя калгасы, правільна арганізаваўшы працу і расставіўшы рабочую сілу, паспяхова справіліся з уборкай. Калгасы Сапоцкінскага раёна поўнасцю закончылі ўборку бульбы. У сціслыя тэрміны правёў уборку калгас імені 8-га сакавіка, Лапскага раёна.

Аднак тэмпы ўборкі па вобласці далёка нездавальняючыя. На 1 кастрычніка план уборкі бульбы выканан на 35 процантаў. Ганебна адстае па ўборцы Гродненскі раён, дзе з плошчы 10586 гектараў убран толькі 231 гектар, што складае 2,2 проценты. Між тым такое становішча ў кіраўнікоў раёна не выклікае асаблівай трывогі.

Не лепшае становішча з уборкай у Скідзельскім раёне. Тут план выканан толькі на 5 процантаў. На столькі-ж выканан план уборкі і на калгасах гэтага раёна. Як відаць, кіраўнікі Гродненскага і Скідзельскага раёнаў забылі, што яны нясуць адказнасць перад партыяй і ўрадам за паспяховае праведзенне бульбаўборачнай кампаніі.

Барацьба з стратамі—важнейшая ўмова паспяховага праведзення ўборкі. Неабходна арганізаваць работу так, каб адразу-ж пасля копкі праводзіць баранаванне і пераворванне бульбяных участкаў. Ручны збор усіх клубняў пасля баранавання і пераворвання можа зберагчы 10—15 процантаў ураджаю. Нельга пакідаць таксама выкапаную бульбу нанач незакрытай.

Першачарговая задача ўсіх калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў — непасрэдна з поля арганізаваць адправу бульбы на прыёмачныя пункты ў лік абавязковых паставак, здаваць дзяржаве бульбу толькі высокай якасці!

Партыйныя і совецкія арганізацыі павінны растлумачыць калгаснікам і аднаасобнікам пастанову ўрада аб тым, што яны могуць прадаваць бульбу на старану толькі пасля выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Трэба растлумачыць калгаснікам, што побач з выкананнем абавязковых паставак бульбы, калгасы маюць права выдаваць як авансам на працадні не звыш 10 процантаў да колькасці, зданай дзяржаве. У першую чаргу выдаюцца авансы тым калгаснікам, якія працуюць на ўборцы бульбы. Ніякага адступлення ад гэтага правіла не можа быць.

Прамы абавязак кіраўнікоў зямельных органаў—дапамагчы праўленням калгасаў устанавіць такі парадак, каб працадні калгаснікам, занятым на ўборцы бульбы, налічваліся толькі па колькасці сабранай бульбы.

Да наступлення замаразкаў асталося не многа часу. Трэба ўзняць тэмпы ўборкі бульбы. Толькі тады, калі кожны калгас, кожны калгаснік і аднаасобнік своечасова закончаць уборку і выканаюць абавязацельствы перад дзяржавай, работа мясцовых партыйных арганізацый у галіне ўборкі і загатовак бульбы можа быць прызнана добрай.

Не патураць зрыўшчыкам бульбапаставак

ВАЎКАВЫСК. (Ад нашага карэспандэнта). З 26 верасня па 1 кастрычніка на здатачныя пункты Ваўкавыскага раёна паступіла 672 тоны бульбы. Прырост выканання плана за гэтыя тыдзень склалае 15,6 процанта. Перадавыя калгасы раёна «Ударнік», Роскага сельсовета, «Першае мая», Мсцібаўскага сельсовета, поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па бульбапастаўках. Калгас «Першае мая» здаў 38,5 тоны бульбы звыш плана. Гудзевіцкі і Астроўскі сельсоветы па 1 кастрычніка выканалі план бульбапаставак на 20 процантаў.

Зусім адваротнае назіраецца ў Бурнаўскім, Віхаваўскім і Тупічанскім сельсоветах. Тут яшчэ не прыступілі да здачы бульбы.

Большасць кулацкіх гаспадарак раёна на бульбаздатачныя пункты бульбы не вязуць. Добаш Станіслава з вёскі Астроўшчына, Шылаўскага сельсовета, павінна здаць 74,9 цэнтнера бульбы, але да здачы яшчэ не прыступіла. Кулак вёскі Сугакі, Гудзевіцкага сельсовета, Абуховіч Віталій з 6 тон бульбапаставак не здаў ні аднаго кілограма. Не прыступалі да выканання свайго задання Баландзь і Ермаловіч, Ізабелінскага сельсовета.

Згодна графіка, кожную пяцідзёнку раён павінен здаваць 1.675 тон бульбы. У сапраўднасці раён здае толькі палову гэтай колькасці.

Тут па-ранейшаму не мабілізавалі ўсіх калгаснікаў і аднаасобнікаў на паспяховае выкананне плана бульбапаставак. Да кулацкіх гаспадарак, якія зрываюць здачу бульбы, мер не прымаюць.

Д. Казлоў.

ЗВОДКА

аб ходзе ворыва зябліва, уборкі бульбы і выканання трактарных работ па Беластоцкай вобласці на 1 кастрычніка 1940 года.

(У процантах да плана).

Назва раёнаў	Паднята зябліва	Выкапана бульбы	Назва раёнаў	Паднята зябліва	Выкапана бульбы
1. Аўгустоўскі	87,4	36,9	13. Крынкаўскі	49,9	29,1
2. Беластоцкі	80,6	34,9	14. Лапскі	95,5	91,2
3. Бельскі	46,0	21,2	15. Ломжынскі	96,7	19,8
4. Бранскі	98,9	49,9	16. Монькаўскі	100,7	81,3
5. Ваўкавыскі	60,0	14,7	17. Парэцкі	65,9	35,2
6. Граеўскі	74,0	30,3	18. Свіслацкі	44,5	20,9
7. Гродненскі	61,8	2,2	19. Скідэльскі	61,4	5,0
8. Дамбраўскі	78,9	48,9	20. Снядаўскі	89,1	59,4
9. Едвабнаўскі	72,3	12,2	21. Саколкаўскі	96,4	22,7
10. Заблудаўскі	88,9	49,4	22. Сапоцкінскі	77,7	38,9
11. Замбраўскі	92,1	51,9	23. Цэханавецкі	84,8	55,4
12. Кольнаўскі	140,7	39,9	24. Чыжаўскі	75,0	42,7
			Разам па вобласці	78,6	35,0

Па Совецкай краіне



На мылаварным заводзе ў г. Выбаргу (Карэла-Фінская ССР) пачаў працаваць свечачны цэх.

На здымку: П. Е. Раманаў правярае якасць свечак.

Фота А. Міхайлава. Фота ТАСС.

ПУШЧАНА 38 ЦУКРОВЫХ ЗАВОДАЎ

КІЕЎ. Буйнейшыя заводы Кіеўскага цукратрэста — Салівонкаўскі, Шпалянскі, Андрушаўскі, Верхнянскі і іншыя прыступілі да краварэння. К 1 кастрычніка з 45 заводаў Кіеўскага цукратрэста працавалі 38.

20-ГОДДЗЕ ТЭАТРА ІМЕНІ В. І. НЕМІРОВІЧА-ДАНЧЭНКА

У кастрычніку адзначаецца 20-годдзе Дзяржаўнага музыкальнага тэатра імені В. І. Неміровіча-Данчэнка.

Тэатр узнік у 1920 годзе як музыкальная студыя Маскоўскага Мастацкага тэатра. Першым спектаклем студыі была камічная опера Лекока «Дачка Анго». Гэты спектакль прайшоў на сцэне тэатра каля 900 разоў і захаваўся ў яго рэпертуары да цяперашніх дзён.

Зараз музыкальны тэатр імені яго арганізатара і кіраўніка — народнага артыста СССР В. І. Неміровіча-Данчэнка шырока вядомы не толькі маскоўскаму гледачу, але і далёка за межамі сталіцы. Ён пабываў на гастролях у буйнейшых гарадах Саюза, а таксама за мяжой. У гэтым годзе тэатр гастраляваў у Данбасе і Кіеве, даў рад шэфскіх спектакляў - канцэртаў на баявых караблях Чарнаморскага флота і ў часцях Чырвонай Арміі.

19 кастрычніка адбудзецца ўрачысты вечар, прысвечаны юбілею тэатра. Будуць паказаны ўрыўкі з балетных пастановак тэатра за 20 год.

ДАРОГА ЭЛІСТА—ДЗІЎНАЕ

ЭЛІСТА. На адбыўшымся ў дзяржаўным тэатры аб'яднаным пасяджэнні абкома партыі і Соўнаркома Калмыцкай АССР з удзелам стаханаўцаў і інжынерна-тэхнічных работнікаў будаўніцтва шасейнай дарогі Эліста — Дзіўнае, асоба вызначыўшымся будаўнікам урачыста ўручаны пачотныя граматы Прэзідыума Вярхоўнага Совета Калмыцкай АССР. Рад удзельнікаў будаўніцтва прэміраван каштоўнымі падарункамі. Усяму калектыву будаўнікоў аб'яўлена ўдзячнасць абласнога камітэта партыі і Соўнаркома Калмыцкай АССР.


ЭСКІЗЫ ВЕЛІЧНАЙ ПАНАРАМЫ

У Маскву звярнуліся з творчай камандзіроўкі мастакі Н. Котаў, П. Пакаржэўскі і П. Дабрынін, якім даручана стварыць эскізы для вялікай мастацкай панарамы «Абарона Царыцына».

Мастак П. Пакаржэўскі расказаў:

— У Сталінградзе мы прабылі каля месяца. За гэты час мы пабывалі на мясцах баёў у раёне станцый Садовая і Варапонава, гутарылі з удзельнікамі гераічных баёў, вывучылі гістарычныя дакументы, сабраныя ў мясцовым музеі.

Мы зрабілі рад зарысовак, эцюдаў з натуры і партрэты. Зараз удзельнікі конкурса прыступаюць да работы над панарэднімі эскізамі панарамы.



Адна з веж Кішынёўскай турмы, у якой у 1906 г. за рэвалюцыйную дзейнасць быў заключан легендарны герой грамадзянскай вайны тав. Катоўскі.

Фота-клішэ ТАСС.

ШТОРМ НАД АРХАНГЕЛЬСКАМ

АРХАНГЕЛЬСК. Днямі, увечары жыхары горада назіралі паўночнае зззяне вялікай сілы. Вечарам-жа ўзняўся шторм, які працягваўся за 4 гадзін раніцы. Сіла ветру дасягнула 10 балаў. У горадзе зламана многа дрэў, пашкоджаны дахі некаторых дамоў. У порце пашкоджана чатыры баржы, некалькі баржаў сарвана з прычалаў.

Гутаркі з чытачом

ШТО ТАКОЕ СОЦЫЯЛІЗМ

1. Ад фантазіі да навукі

400 з лішкам год назад англічанін Томас Мор напісаў невялікую кніжку «Утопія». У гэтай кніжцы абмалявана карціна шчаслівага, свабоднага жыцця людзей на фантастычным востраве Утопія. Зямля і ўсе багацці, вытвараемыя людзьмі гэтага вострава, былі агульнымі, калектыўнымі. Сярод жыхароў вострава не было ні багатых, ні бедных. Усе працавалі, займаліся навукамі, мастацтвам. Утапійцы жылі ў поўным забеспячэнні і ні ў чым не адчувалі нястачы.

Так упершыню, у мастацкай форме, была выражана ідэя соцыялізма.

Лепшыя розумы чалавецтва марылі аб такім грамадскім ладзе. Але да пары да часу ўсё гэта аставалася толькі прыгожай марай. Людзі не ведалі, якімі-ж шляхамі ісці да свабоднага жыцця.

Утапісты, падобна Томасу Мору, меркавалі, што добрае жыццё для ўсіх людзей запануе мірным шляхам. Трэба толькі пераканаць багатых, і ўсё наладзіцца само сабой, ціха, мірна, без кровепраліцця, без рэволюцыі. Усё гэта былі «ідэальныя планы», але адарваныя ад сапраўднага жыцця грамадства. Багатыя ніколі добраахвотна не адмаўляюцца ад свайго дабра, ад жыцця за кошт грабяжу працоўных.

Утапісты крытыкавалі парадкі буржуазнага грамадства, паказвалі пакуты пролетарыята, указвалі на неабходнасць яму дапамагчы. Але далей добрых пажаданняў утапісты не пайшлі.

Вялікія настаўнікі рабочага класа Маркс і Энгельс упершыню паказалі, што пролетарыят — не толькі пакутуючы клас. Тлумачачы гэту думку, Ленін пісаў: «Іменна тое ганебнае эканамічнае становішча, у якім знаходзіцца пролетарыят, нястрымна штурхае яго ўперад і прымушае змагацца за сваё канчатковае вызваленне... Палітычны рух рабочага класа непазбежна прывядзе да ўсведамлення таго, што ў іх няма выхаду акрамя соцыялізма». (Ленін, том I, стар. 412).

Маркс і Энгельс указалі на гістарычную ролю пролетарыята, як магільшчыка капіталізма і стваральніка новага грамадства — соцыялістычнага. Толькі пролетарыят здолен узначаліць рух мас за соцыялізм, бо гэты клас мае вялікую будучыню: ён звязан з найбольш перадавой формай гаспадаркі — з фабрыкамі і заводамі, з буйнай вытворчасцю.

Пролетарыят увесь час расце, развіваецца палітычна. Самыя ўмовы працы на буйнай вытворчасці садзейнічаюць з'яднанню і арганізацыі рабочых. Эканамічнае становішча пролетарыята робіць яго самым рэволюцыйным класам грамадства, бо ў рэволюцыі яму губляць няма чаго, акрамя сваёй галечы, акрамя сваіх кайданоў.

Маркс і Энгельс вучылі пролетарыят, што рабочыя павінны разам весці барацьбу супроць капіталістаў-прыгнятальнікаў. Рабочым трэба стварыць сваю палітычную партыю, якая накіроўвала-б класавую барацьбу па рэволюцыйнаму шляху. Рабочы клас павінен аб'еднаць вакол сябе ўсіх прыгнечаных горада і вёскі і насільственым шляхам — праз пролетарскую рэволюцыю — звергнуць **уладу буржуазіі**, устанавіць сваю ўладу, сваю дыктатуру, каб падавіць супраціўленне эксплаататараў і пабудаваць новае, соцыялістычнае грамадства.

Такім чынам, Маркс і Энгельс, у процілегласць утапістам, першыя растлумачылі, што соцыялізм — не выдумка, не фантазія безгрунтоўных летуценнікаў, а неабходны рэзультат развіцця грамадства.

Так соцыялізм з мары аб лепшым будучым чалавецтва быў ператвораны ў навуку аб барацьбе і перамозе пролетарыята над капіталізмам. Кіруючыся гэтай навукай, кіруючыся рэволюцыйным вучэннем Маркса і Энгельса, развітым і дапоўненым Леніным і Сталіным, рабочыя і працоўныя сяляне СССР зрабілі Вялікую Кастрычніцкую соцыялістычную рэволюцыю 1917 года.

Перамога над старым светам далася нялёгка: многа крыві лепшых, гераічных сыноў народа было пралітa на франтах грамадзянскай вайны, у баях супроць унутранай контррэволюцыі і міжнароднага імперыялізма. Неймаверных намаганняў, сур'ёзных лішэнняў каштавала совецкаму народу самаадданая барацьба за ператварэнне адсталай у мінулым краіны ў магутную, перадавую ў тэхнічных адносінах дзяржаву.

2. Без капіталістаў, без прыгнятальнікаў

Совецкі Саюз — краіна магутнейшай індустрыі, новай тэхнікі, новых, нябачаных у гісторыі чалавецтва тэмпаў будаўніцтва. СССР перагнаў галоўныя капіталістычныя краіны па тэхніцы вытворчасці і хуткасці развіцця прамысловасці. Непазнавальнай стала сельская гаспадарка. Аднаасобныя карлікавыя сялянскія гаспадаркі добраахвотна аб'ядналіся ў буйныя калектыўныя гаспадаркі, якія рабоча-сялянская дзяржава забяспечыла і працягвае забяспечваць трактарамі, камбайнамі і іншымі машынамі.

Змяніўся твар совецкай краіны. Змянілася і становішча грамадзян соцыялістычнай дзяржавы.

Рабочы клас СССР з эксплаатуемага, пазбаўленага прылад і сродкаў вытворчасці, якім ён быў пры капіталізме, стаў свабодным класам, падобнага якому не ведала яшчэ гісторыя чалавецтва.

Сялянства, якое раней было паняволькцу прывязана да дробных гаспадарак з адсталай прымітыўнай тэхнікай і бязлітасна эксплаатавалася памешчыкамі, кулакамі, спекулянтамі, растаўшчыкамі, таксама стала свабодным, у пераважнай масе, калгасным сялянствам.

Змянілася таксама інтэлігенцыя СССР. Яе пераважная большасць выйшла з асяроддзя рабочых і сялян. Моцна звязалі свой лёс з совецкай уладай і кадры старой інтэлігенцыі. Совецкая інтэлігенцыя— роўнапраўны член совецкага грамадства.

Рабочыя, сяляне, інтэлігенцыя— усе ў адной дружнай і вялікай сям'і вядуць будаўніцтва новага, бяскласавага соцыялістычнага грамадства.

Эксплаататарскіх класаў у СССР няма. Памешчыкі, капіталісты, кулакі, купцы, спекулянты ліквідаваны. У горадзе і ў вёсцы працуюць без гаспадароў, без эксплаататараў. Кіруюць работай людзі з народа. Улада належыць народу ў асобе Советаў дэпутатаў працоўных. Гэта і называецца соцыялістычным жыццём. СССР—першая ў свеце соцыялістычная дзяржава рабочых і сялян.

3. Соцыялізм і праца неаддзялімыя

Соцыялізм ёсць агульнае ўладанне прамысловасцю, транспартам, сельскай гаспадаркай і ўсімі іншымі багаццямі грамадства. Зямля, фабрыкі, заводы, шахты, лясы — усё гэта з'яўляецца не ўласнасцю прыватных асоб, а ўсенародным здабыткам. Грамадская ўласнасць на сродкі і прылады вытворчасці выключаюць якую-б там ні было магчымасць эксплаатацыі чалавека чалавекам.

Пры соцыялізме праца ўжо не можа быць пастылым заняткам, цяжарам, бо людзі працуюць не на памешчыкаў і капіталістаў, а на сябе, на сваю дзяржаву, на свой народ.

Праца ў совецкіх людзей — пярвейшы абавязак. У той-жа час гэта радасць, бо чым лепш чалавек працуе, тым больш ён дапамагае паляпшаць жыццё ўсяго грамадства. А чым багацей усё грамадства, чым багацей наша дзяржава, тым лепш жывецца кожнаму чалавеку. Грамадскае становішча чалавека ў совецкай дзяржаве вызначае не багацце, а толькі чэсная праца і асабістыя здольнасці. Калі ты добра, прадукцыйна працуеш — ты авеян славай, ты герой працы.

Буржуазія паклёпнічала на рабочы клас і соцыялізм. Лакеі капіталізма сцвярджалі, што з ліквідацыяй прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці запануе ўсеагульная ленасць. Працоўныя СССР развеялі ўшчэнт буржуазны паклёп. Яны даказалі, што соцыялізм і праца неаддзялімыя адзін ад другога. Інакш могуць думаць толькі паразіты — дармаеды і лодыры.

«Соцыялізм, — гаворыць таварыш Сталін, — можа быць пабудован толькі на базе бурнага росту вытворчых сіл грамадства, на базе багацця прадуктаў і тавараў, на базе заможнага жыцця працоўных, на базе бурнага росту культурнасці».

Для гэтага неабходна чэсна і прадукцыйна працаваць. Соцыялізм не церпіць людзей не працуючых, жывучых за кошт чужой працы. Соцыялізм аснован на свядомай дысцыпліне працы.

4. Як комуністы разумеюць роўнасць

У соцыялістычным грамадстве людзі жывуць па прынцыпу: «Хто не працуе, той не есць», «ад кожнага па яго здольнасці, кожнаму — па яго працы». Гэта значыць, што за роўную колькасць і якасць працы людзі атрымліваюць роўную аплату; за розную колькасць і якасць працы — розную аплату. І гэта правільна. У СССР ёсць кваліфікаваныя рабочыя і некваліфікаваныя. Не могуць аднолькава атрымліваць, скажам, паравозны машыніст і прыбіральшчыца. Першы многа вучыўся, многа працаваў, пакуль стаў вадзіцелем паравозаў, а каб быць прыбіральшчыцай, вучыцца не трэба. Таксама не могуць аднолькава атрымліваць, напрыклад, урач і рахункавод, інжынер і слесар.

Усякая прафесія ў СССР аднолькава пачотная. Але ёсць розніца паміж працай кваліфікаванай і некваліфікаванай, паміж працай разумовай і фізічнай. Стала быць, нельга ставіць усіх у аднолькавыя ўмовы аплаты працы.

Марксісцкі соцыялізм нічога агульнага не мае зураўнілаўкай, зураўненнем патрэбнасцей членаў грамадства. Таварыш Сталін указваў, што нельга патрабаваць, каб ва ўсіх людзей былі аднолькавыя патрэбнасці і густы, каб людзі ў асабістым быту жылі па якому-небудзь стандарту, па адзінаму ўзору. Гаварыць, што пры соцыялізме (ці комунізме) «усе павінны хадзіць у аднолькавых касцюмах і есці адны і тыя-ж стравы, у адной і той-жа колькасці,—значыць гаварыць пошласці і паклёпнічаць на марксізм».

Пад роўнасцю марксізм-ленінізм разумее не ўраўнілаўку ў галіне асабістага быту, а знішчэнне класаў, гэта значыць роўнае вызваленне ўсіх працоўных ад эксплаатацыі, ад улады капіталістаў і памешчыкаў; роўную адмену для ўсіх прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці; роўны абавязак усіх працаваць і атрымліваць плату ў адпаведнасці з колькасцю і якасцю працы. Такія парадкі ў соцыялістычным грамадстве.

Соцыялістычны прынцып аплаты працы матэрыяльна заахвочвае людзей у павышэнні сваёй прадукцыйнасці, культурнага ўзроўню, ведаў. Чым больш чалавек умее і ведае, чым больш і лепш ён працуе, тым больш ён атрымлівае, тым больш прадметаў спажывання пераходзіць у яго асабістае карыстанне.

Так разлятаецца, як дым, буржуазны вымысел аб тым, што пры соцыялізме няма ніякай уласнасці наогул. Няма прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці, якая служыць сродкам эксплаатацыі чужой працы. Гэта праўда. Але ёсць прыватная ўласнасць соцыялістычных грамадзян на прадметы спажывання, на працоўныя даходы і зберажэнні, на жылы дом, на прадметы хатняй гаспадаркі і ўжытку. Такая ўласнасць не можа быць сродкам эксплаатацыі, і таму яна не толькі не ліквідуецца, але і ахоўваецца соцыялістычным законам.

5. Свабода асобы ў СССР

Соцыялізм забяспечвае поўнае развіццё здольнасцей асобы і яе сапраўдную свабоду.

Таварыш Сталін гаворыць: соцыялістычнае грамадства «мы пабудуем не для ўшчамлення асабістай свабоды, а для таго, каб чалавечая асоба адчувала сябе сапраўды свабоднай. Мы пабудуем гэта дзеля сапраўднай асабістай свабоды, свабоды без двухкосся. Мне цяжка ўявіць сабе, якая можа быць «асабістая свабода» у беспрацоўнага, які ходзіць галодным і не знаходзіць прымянення сваёй працы. Сапраўдная свабода ёсць толькі там, дзе знішчана эксплаатацыя, дзе няма прыгнечання адных людзей другімі, дзе няма беспрацоўя і галечы, дзе чалавек не дрыжыць за тое, што заўтра можа страціць работу, жыллё, хлеб. Толькі ў такім грамадстве магчыма сапраўдная, а не папяровая асабістая і ўсякая іншая свабода».

У совецкай краіне не можа быць беспрацоўя, не можа быць крызісаў, бо ўся гаспадарка вядзецца па аднаму гаспадарчаму дзяржаўнаму плану. Таму совецкая дзяржава можа гарантыраваць кожнаму працаздольнаму права на працу.

У СССР няма капіталістычнай канкурэнцыі, прынцыпам якой з'яўляецца паражэнне і смерць адных у імя дабра другіх. У капіталістычным грамадстве чалавек чалавеку — воўк. Архітэктар, каб працаваць і не памерці з голаду, павінен марыць аб тым, каб было больш пажараў у горадзе, — тады прыдзецца будаваць новыя дамы і яго прызавуць працаваць. Шкляр павінен жадаць таго, каб град пабіў ва ўсіх шыбы. Шавец,—каб абутак часцей рваўся. Капіталістычнае грамадства так пабудавана, што ці ты грабіш другога, ці цябе грабяць.

Пры соцыялізме складваюцца зусім другія адносіны: адносіны таварыскага супрацоўніцтва і ўзаемнага падтрымання. Адзін за ўсіх— усе за аднаго. Чалавек чалавеку — друг, таварыш! Стаханаўцы не трымаюць у сакрэце сваё майстэрства. Насупроць, яны шырока перадаюць свой вопыт усім рабочым, якія дабіваюцца агульнага ўздыму ўсяго завода, усёй прамысловасці, усёй сельскай гаспадаркі.

6. Вялікія правы і абавязкі грамадзян СССР

Соцыялізм прадастаўляе ўсім грамадзянам выдатныя правы: права на працу, права на адпачынак, права на асвету, права на матэрыяльнае забеспячэнне ў старасці і ў выпадку страты працаздольнасці.

Грамадзянам СССР закон соцыялістычнай дзяржавы гарантыруе свабоду слова і друку, мітынгаў і сходаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый.

Соцыялізм дае ўсім нацыянальнасцям роўныя правы, садзейнічае росквіту нацыянальных па форме і соцыялістычных па зместу культур, мастацтваў народаў Совецкай краіны.

Соцыялізм зрабіў жанчыну роўнапраўнай з мужчынам ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага і культурнага жыцця. Жанчына матэрыяльна незалежна: яна сама зарабляе на жыццё чэснай працай. Вось чаму соцыялістычная сям'я пабудавана ў нас на ўзаемнай павазе яе членаў.

Аднак соцыялізм дае не толькі вялікія правы: ён ускладае і свяшчэнныя абавязкі на членаў грамадства. Соцыялізм пабудаван у СССР не на ўтапічным востраве, адрэзаным ад усяго астатняга свету, а на адной шостай частцы зямнога шара, акружанай капіталістычнымі дзяржавамі. Адсюль важнейшы і свяшчэнны абавязак нашых грамадзян: абараняць соцыялістычную бацькаўшчыну, умацоўваць Чырвоную Армію, Ваенна-Марскі і Паветраны Флоты, умацоўваць ваенную і гаспадарчую магутнасць краіны.

Соцыялізм абавязвае грамадзян берагчы народнае дабро, ахоўваць грамадскую ўласнасць, як зяніцу вока. Хто раскрадае, псуе народнае дабро — той вораг соцыялізма.

Завяршаючы будаўніцтва соцыялізма, народы СССР паступова пераходзяць да комунізма. Наш ідэал — поўнае комуністычнае грамадства, дзе канчаткова знікнуць усякія класы і класавая розніца, дзе не будзе розніцы паміж людзьмі разумовай і фізічнай працы, паміж горадам і вёскай. Асноўным прынцыпам поўнага комуністычнага грамадства будзе: «Ад кожнага — па яго здольнасцях, кожнаму — па яго патрэбнасцях».

Але для гэтага патрабуецца велізарнае, небывалае ў гісторыі развіццё тэхнікі, павышэнне прадукцыйнасці працы. У комуністычным грамадстве ўсякая праца будзе кваліфікаванай. Праца будзе пярвейшай патрэбнасцю ўсіх грамадзян. І тады кожны чалавек будзе атрымоўваць усё, што яму неабходна для задаволення яго патрэбнасцей.

Адсюль просты і ясны вывад: неабходна чэсна і самаадданa працаваць, выхоўваць комуністычныя адносіны да працы, да грамадскай уласнасці, да грамадскага доўгу. Комуністычнае выхаванне працоўных — важнейшая задача соцыялістычнага грамадства. Гэта і важнейшая ўмова далейшага прасоўвання ўперад — да поўнага комунізма.



Стаханаўцы другога беластоцкага тэкстыльнага камбіната правяраюць якасць гатовага матэрыялу, выпрабленага ў трэцім квартале.

На здымку (злева направа): шпулярка М. Я. Фурман, брыгадзір-сукнамыйшчык І. А. Маславецкі, сукнамыйшчык Ф. А. Завадскі, сакрэтчыца А. Н. Скаўронская. Фота А. Сапіра.

Цэхі мяняюць аблічча

Мыечны цэх. Па абодвух баках размешчаны машыны, якія прамываюць сураўё. Велізарныя барабаны плаўна варочаюцца, захапляючы сабою мокрыя палосы тканін.

Цэх яшчэ абсталёўваецца. Змяняецца тут усё, нават падлогі, дзе ў любы момант можна было спатыкнуцца.

У фарбавальным цэху кіпіць будаўнічая работа. Кажуць, што яго рэканструіруюць. Гэта няправільна. Правільней будзе сказаць, што яго робяць нанова. Тое, што было раней, цэхам назваць нельга. Гэта быў дрэнны хлеў. І цяпер усё трэба перарабіць, абнавіць, пабудаваць сапраўдны фарбавальны цэх.

Дырэктар камбіната тав. Раксін расказвае аб цяжкасцях, якія прышлося перамагчы калектыву за год творчай і плённай работы. Зроблена нямала. Але яшчэ больш работы ўперадзе. У лістападзе мінулага года ён быў прадстаўніком Часовага ўпраўлення па нацыяналізацыі прадпрыемстваў, затым стаў кіраваць камбінатам. Ён вам можа расказаць аб першых днях работы прадпрыемства, якое стала народным здабыткам; аб людзях, якія з велізарнай і невычарпальнай сілай узяліся за справу.

Здаецца, тыя самыя станкі працавалі ў час панавання фабрыкантаў, але адносіны да іх зараз іншыя. «Гэта наша, народнае», — гавораць рабочыя.

На соцыялістычным прадпрыемстве выраслі цудоўныя людзі. Сярод ткачоў ёсць 19 многастаночнікаў. Усе ткачы асвоілі норму выпрацоўкі і перавыконваюць яе. Выдатных поспехаў дабіліся матальшчыцы. Іх на прадпрыемстве налічваецца 18 чалавек. З іх 11 штодзённа выконваюць план звыш чым на 120 процантаў.

Толькі з 16 верасня ўведзены новыя нормы выпрацоўкі для прадзільнага аддзела. І ўжо некаторыя работніцы праславіліся сваёй высокапрадукцыйнай стаханаўскай работай. Работніцы пераходзяць на ўшчыльнены метад абслугоўвання і дабіваюцца добрых вынікаў. Норма на адну сельфактаршчыцу — 165 верацён. Гэту норму стаханаўкі значна перакрываюць. Вось, напрыклад, стаханаўкі Камінская і Амельянюк абслугоўваюць удвух 500 верацён і выконваюць план на 118 процантаў. Работніцы Міцуля і Врублеўская працуюць на 460 верацёнах і выконваюць план на 136 процантаў.

Адным з лепшых майстраў высокай прадукцыйнасці працы на камбінаце лічыцца ткач т. Гельштэйн, які выконвае план на 115 процантаў. Аднойчы за работай тав. Гельштэйна назірала работніца маскоўскай фабрыкі. Яна была ў захапленні ад бачанага.

Прыкладу стаханаўца Гельштэйна следуюць ткачы тт. Ятвецкі, Гутман і іншыя.

Калектыў камбіната № 17 за год работы зрабіў многае. Запушчаныя фабрыкі з бруднымі памяшканнямі ператвараюцца ў культурныя прадпрыемствы, дзе сканцэнтрыраван увесь вытворчы цыкл. Расце прадпрыемства, растуць яго людзі.

Камбінат рыхтуецца дастойна сустрэць XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Гэтую слаўную дату калектыў імкнецца сустрэць новымі радаснымі вынікамі. Дзевяцімесячны план па камбінату выканан яшчэ ў пачатку жніўня. У верасні план выканан на 128,3 процанта. Прадпрыемства цяпер выконвае адказнае ўрадавае заданне — драп для работнікаў маскоўскага метрапалітэна. Калектыў з вялікай увагай адносіцца да выканання гэтага задання.

І. Апельбаум.

Не дапусціць зрыву будаўніцтва

Партыя і ўрад заўсёды ўдзяляюць велізарную ўвагу добрабыту працоўных. Вялікія сродкі адпускаюцца на пабудову новых жыллёвых будынкаў, упарадкаванне гарадоў.

У Ломжы паасобныя кіраўнікі не клапоцяцца аб будаўніцтве і сваімі нядбайнымі адносінамі да скарыстання адпушчаных сродкаў на павелічэнне жыллёвай плошчы давялі будаўніцтва да зрыву.

Асваенне адпушчаных сродкаў на рамонт жыллёвых будынкаў і аднаўленне горада ідзе вельмі марудна. З адпушчанага 1 мільёна рублёў выдаткавана толькі 239,6 тысячы рублёў. За ўвесь летні будаўнічы сезон здан толькі адзін будынак, на які выдаткавана 149 тысяч рублёў.

Цяпер частка аб'ектаў знаходзіцца ў закансерваваным становішчы. Да іх адносіцца дом соцыялістычнай культуры, у будаўніцтва якога ўкладзена 70 тысяч рублёў, школа № 4 — 95,2 тысячы рублёў.

Будаўніцтва гэтых аб'ектаў прыпынена. Гэта атрымалася з-за бескантрольнасці. Так, напрыклад, гарадскі фінансавы аддзел фінансіраваў камунгас, а асваенне гэтых сродкаў не кантраліраваў. У выніку грошы, прызначаныя для пашырэння жыллёвай плошчы, скарыстаны на іншую мэту. Загадчык горкамгаса тав. Чэрноў замест аператыўнага кіраўніцтва жыллёвым будаўніцтвам дапусціў зацяжку ў складанні каштарысаў і праектаў, што з'явілася тормазам у жыллёвым будаўніцтве. Больш таго, гэты загадчык дапусціў разбазарванне будаўнічых матэрыялаў, як цэмент, таўравыя балькі, вапна і іншыя.

Прэзідыум горвыканкома яшчэ ў чэрвені сігналізаваў аблвыканкому і аблбудтрэсту аб пагрозе зрыву будаўніцтва. Аднак ні аблбудтрэст, ні аблвыканком ніякай дапамогі не аказалі. І не дзіўна, што цэлы рад аб'ектаў, якія зацверджаны планам, не будуецца. На пабудову лазні было затрачана 32 тысячы рублёў, але чамусьці будаўніцтва яе спынена. Падобныя факты ёсць і на іншых аб'ектах.

Зіма не за гарамі. Трэба цяпер прыняць неабходныя меры, каб да наступлення марозаў закончыць пабудовы дамоў і рамонт кватэр. Ёсць усе магчымасці закончыць гэту работу. Патрабуецца толькі планамернае снабжэнне будаўнічымі матэрыяламі. Аблвыканком павінен прыняць тэрміновыя захады да недапушчэння зрыву будаўніцтва ў Ломжы.

Н. Разбіралаў,
старшыня гордзяржплана.

ПАЛІВАМ ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧАНЫ

У гутарцы з супрацоўнікам рэдакцыі дырэктар Беластоцкай табачнай фабрыкі тав. Оксман расказаў аб рабоце, праведзенай па падрыхтоўцы прадпрыемства да зімы.

— Паравая гаспадарка фабрыкі,— сказаў тав. Оксман, — доўгі час знаходзілася ў вельмі запушчаным становішчы. І галоўную ўвагу мы ўдзялілі прывядзенню яе ў парадак. Гэта работа ўжо закончана.

Што датычыцца загатоўкі паліва на зімовы перыяд, прадпрыемства поўнасцю ім забяспечана. Акрамя таго, на фабрыцы праведзены і другія мерапрыемствы па падрыхтоўцы да зімы. У прыватнасці, зашклёны ўсе шыбы, прыведзены ў спраўнасць дзверы, прыступілі да вырабу другіх рам, чаго на гэтым прадпрыемстве ніколі не было. Уперадзе яшчэ нямала работы па падрыхтоўцы прадпрыемства да зімы. У хуткім часе мы прыступім да ацяплення цэхаў фабрыкі.

БОЛЬШ ВЫСОКАЯКАСНАГА ЦЭМЕНТУ

У 16 кілометрах ад горада Ваўкавыска, на беразе ракі Рось, знаходзіцца адзіны ў заходніх абласцях Савецкай Беларусі цэментны завод. Да 17 верасня 1939 года завод працаваў сезонна. У пачатку зімы ён звычайна заканчваў сваю дзейнасць. Гаспадары завода на зіму звальнялі асноўную масу рабочых, пакідаючы для рамонту больш кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў.

З прыходам Чырвонай Арміі і ўстанаўленнем савецкай улады завод упершыню стаў працаваць круглы год.

Калі ў час панавання эксплаататараў прадукцыйнасць адной печы складала 8,6 тоны ў гадзіну, то цяпер прадукцыйнасць печы дасягае больш 9,2 т ны ў гадзіну. Непараўнальна вырасла якасць выпускаемай прадукцыі. Наш савецкі цэмент значна лепшы, чым той, які выпускаўся раней.

Першы год работы ў савецкіх умовах даў на 47 тысяч тон цэменту больш, чым выпускаў завод раней за год. З сакавіка на ўсіх працэсах вытворчасці ўведзены нормы выпрацоўкі і расцэнкі. Гэтыя нормы выпрацоўкі ўжо не толькі асвоены рабочымі, але яны перавыконваюцца. Машыністы экскаватараў у жніўні выканалі месячнае заданне на 121,5 процанта, ломшчыкі гліны—на 150 процантаў, рабочыя паветрана-канатнай дарогі — на 120-129 процантаў, млынары сыравінных млыноў—на 136,4 процанта, абпальшчыкі верцячыхся печаў—на 110,9 процанта.

З былых чорнарабочых больш дзесятка чалавек вылучаны на кіруючую работу. Так, напрыклад, Віктар Смаршко назначан загадчыкам гужавога транспарта, грузчык Пугач—начальнікам транспартнага цэха, былыя грузчыкі тт. Поух, Санцэвіч, Шагун—майстры ўпаковачнага цэха. 60 чалавек займаюцца ў гуртку тэхнічнай вучобы. Унядраючы стаханаўскія метады працы, нам удалося значна павысіць заработную плату рабочых. Пасля ўвядзення новых норм выпрацоўкі зарплата ўзрасла на 35 процантаў. Рабочы кар'ера Іван Чырвонік у жніўні зарабіў 725 рублёў, апальшчык Іосіф Верациіла—760 рублёў і т. д.

Палепшыўся і добрабыт рабочых. Большасць кватэр адрамантавана. У гэтым годзе рабочыя карыстаюцца першым ураджаем, сабраным з падсобнай гаспадаркі. Па танных цэнах яны атрымліваюць гародніну, мяса і іншыя прадукты. Мы абсталявалі сталовую, у якой рабочы атрымлівае снеданне, абеды, вячэру. Адрамантаван клуб, устаноўлена гукавое кіно, заканчваецца будаўніцтва новага двухпавярховага будынка на 18 кватэр, адкрыты дзіцячы сад, чырвоны куток для рабочых кар'ера.

На заводзе выраслі дзесяткі энтузіястаў сацыялістычнай працы. Абпальшчык Іосіф Верація, праводчык Антон Шындлер, работніца кар'ера Надзежда Чырвонік, машыніст турбіны Осцелоўскі, галоўны энергетык Станіслаў Гаузер па праву лічацца лепшымі людзьмі завода, карыстаюцца ўсеагульнай павагай сярод калектыва нашага прадпрыемства.

За восем месяцаў работы з'эканомлена 2.100 тысяч рублёў. Выкананы ўсе планавыя і якасныя паказчыкі. Узорная работа дала магчымасць стварыць свой дырэктарскі фонд, палова якога ідзе на жыллёвае будаўніцтва.

На 1941 год прадугледжана павелічэнне прадукцыйнасці працы на 7 процантаў, зніжэнне сабекошту на 9 процантаў. На капітальнае будаўніцтва ў будучым годзе намечана выдаткаваць 1.400 тысяч рублёў.

Аднак нельга сказаць, што на заводзе ўсё ў парадку. Завод мае своеасаблівыя ўмовы. Большасць рабочых звязаны з сельскай гаспадаркай, і гэта часта адбіваецца на працоўнай дысцыпліне. Многія рабочыя адной нагой стаяць на сацыялістычным прадпрыемстве, а другой —на ўласнай гаспадарцы. З 1 студзеня і да выдання Ўказа ад 26 чэрвеня на заводзе было 966 дзён прагулаў. Аб'явіўшы рашучую барацьбу з дэзарганізатарамі вытворчасці, мы дабіліся зніжэння прагулаў. У жніўні прагулаў і спазненняў было 11, у верасні колькасць іх значна паменшылася. Дабіцца поўнай ліквідацыі прагулаў і спазненняў нам пакуль не ўдалося.

Значныя перашкоды ў нашай рабоце адбываюцца па віне чыгункі, якая часта несвоечасова падае вагоны для адгрузкі цэменту. Па далёка няпоўных падліках, наш завод недадаў краіне па віне чыгункі звыш 6 тысяч тон гатовай прадукцыі.

Мы не сумняваемся, што ўсе гэтыя недахопы будуць ліквідаваны. Наш калектыў узяў на сябе абавязацельства дастойна сустрэць XXIII гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Мы абавязаліся да 25 снежня закончыць гадавую праграму па ўсіх паказчыках.

Б. Плаўнік,
дырэктар цэментнага завода.

Тэатр Юнага гледача БССР напярэдадні ўсесаюзнага агляду

У квітнеючым прыгожым Беластоку тэатр Юнага гледача заканчвае сваё шасцімесячнае гастрольнае падарожжа па рэспубліцы.

Гэта творчая справаздача тэатра перад сваімі новымі гледачамі прысвечана ўсесаюзнаму агляду дзіцячых тэатраў, які адбудзецца ў Маскве 15 лістапада.

За час гастролей тэатр абслужыў піянераў і школьнікаў гарадоў Бабруйска, Магілева, Мозыра, Гродна, Пружаны і Брэста.

У Беластоку тэатр Юнага гледача будзе працаваць да 15 кастрычніка. Тэатр паказаў юным і дарослым гледачам горада лепшыя свае спектаклі: «Як гартавалася сталь» па аднайменнаму раману пісьменніка-бальшэвіка Н. Астроўскага.

Спектакль «Як гартавалася сталь» расказвае аб любімым героі савецкай моладзі Паўле Карчагіне, аб слаўных старонках ленінска-сталінскага комсамола, аб барацьбе нашай маладой рэспублікі з белапольскімі акупантамі і балахоўскімі бандамі.

Другая пастаноўка, якую ўпершыню бачылі юныя гледачы, гэта спектакль «Цудоўная дудка» Віталія Вольскага. Спектакль «Цудоўная дудка» у цікавых мастацкіх вобразах адлюстроўвае думы і імкненні нашага народа, які яшчэ ў далёкія мінулыя часы вёў жорсткую барацьбу супроць драпежных польскіх паноў — сваіх лютых ворагаў. Спектакль багаты народнымі песнямі, музыкай і танцамі. Пастаноўка «Цудоўнай дудкі» карыстаецца вялікім поспехам сярод нашых юных гледачоў: за адзін толькі сезон яна ставілася каля 100 разоў.

Спецыяльнай камісіяй Усесаюзнага камітэта па справах мастацтваў пры СНК СССР спектакль «Цудоўная дудка» адабраны для паказу ў Маскве на аглядзе лепшых дзіцячых тэатраў Савецкага Саюза.

Аб прыгодах смелай дзяўчынкі Герды, якая, не баючыся ніякіх перашкод, разбойнічай шайкі і злога караля, дасягае сваёй мэты,—расказвае красачны спектакль «Снежная каралева» Е. Шварца, напісаная па матывах казак Андэрсена.

Сваe гастролі ў Беластоку тэатр закончыць паказам новай прэм'еры «Казка» Міхаіла Светлова. Гэта адзін з выдатных твораў савецкай драматургіі, прысвечаных нашаму юнацтву. «Казка» паэта Светлова—гэта жыццёвая, рэальная мара нашых людзей, юных патрыётаў краіны сацыялізма.

Спектаклі тэатра Юнага гледача карыстаюцца вялікім поспехам у нашых гледачоў. Школьнікі і піянеры заходніх абласцей палюбілі свой тэатр, сваіх акцёраў. Яны марацы быць такімі-ж бясстрашнымі бальшавікамі, як Павел Карчагін, як смелы і адданы народны герой пастух Янка з «Цудоўнай дудкі», які аслабаняе сялян ад панскай няволі.


Зараз калектыў тэатра Юнага гледача БССР з вялікім творчым натхненнем рыхтуецца да свайго свята — Усесаюзнага агляду дзіцячых тэатраў. Будзе падрыхтавана дзве новых пастаноўкі: п'еса беларускага драматурга М. Таубе «На парозе жыцця» — аб савецкай школе, адначасова калектыў працуе над славутай камедыяй Мальера «Плутні Скапена».

Паказ творчых дасягненняў нашага тэатра ў Маскве разам з 16 лепшымі дзіцячымі тэатрамі Савецкага Саюза з'яўляецца вялікай чэсцю для маладога калектыва тэатра Юнага гледача БССР ім. Н. К. Крупскай.

Вл. Стэльмах.

Падрыхтоўка да святкавання 85-годдзя з дня смерці Адама Міцкевіча

Абком КП(б)Б стварыў камітэт па падрыхтоўцы да святкавання 85-годдзя з дня смерці выдатнага польскага пісьменніка-гуманіста Адама Міцкевіча. У камітэт уваходзіць 15 чалавек: тт. Прытыцкі—дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, намеснік старшыні аблвыканкома; Пестрак—дэпутат Вярхоўнага Савета СССР, пісьменнік; Венгерка—мастацкі кіраўнік польскага тэатра; Бранеўская — польская дзіцячая пісьменніца; Бароўская — актрыса польскага тэатра; Ландаў — мастак і іншыя. Камітэт узначальвае сакратар абкома КП(б)Б тав. Сямёнаў.



Актывісты мопраўскай работы, рабочыя 5-га тэкстыльнага камбіната, узнагароджаныя пачотнай граматай ЦК МОПР'а СССР.

На здымку: (злева направа) І. С. Краташынскі, І. В. Лега, М. Н. Капялюшнік.

Фота А. Сапіра.

Пісьмы ў рэдакцыю

Я быў у роднай Маскве

Пры панаванні капіталістаў і памешчыкаў я працаваў на самых цяжкіх работах, а аб адпачынку нельга было нават і марыць. Пры савецкай уладзе я стаў працаваць у радах рабоча-сялянскай міліцыі. Я ахоўваю народнае дабро.

Увесь час я марыў аб тым, каб пабываць у нашай роднай сталіцы — у любімай Маскве. Мае мары збыліся. Атрымаўшы водпуск, 27 жніўня я накіраваўся ў Маскву. Калі прыехаў на Беларускі вакзал, ад радасці на вачах у мяне паявіліся слёзы.

Я папаў на ўрачыстае свята — Міжнародны юнацкі дзень, калі моладзь Масквы дэманстравала сваю баявую магутнасць. Сэрца забілася радасна, калі я ўбачыў сотні тысяч юнакоў і дзяўчат, ідучых з вясёлымі песнямі пад чырвонымі сцягамі.

Я быў у маўзалеі Леніна і бачыў незабыўнага правадыра і настаўніка працоўных усяго свету.

Ездзіў па метро, які абсталяван лепш, чым ва ўсіх іншых сталіцах свету.

На кожным кроку бачыш у Маскве радаснае, кіпучае жыццё.

Н. Навасад,
міліцыянер дарожнага аддзела ст. Ваўкавыск.

Аб рэстаране „Люкс“

Усім добра вядома, што ў Беластоку ёсць «выдатны» рэстаран «Люкс». На жаль, гэтая гучная назва не адпавядае сапраўднасці. У рэстаране пануе бруд; усё там выключна запушчана, занядбана. Сцены пыльныя, у вутлах звісае павуціна, сталы мытыя вельмі дрэнна. Абрусы на сталах заўсёды замазаны, поўна на іх плям. Афіцыянткі, з распушчанымі валасамі, абслугоўваюць наведвальнікаў у брудных халатах і касынках. Кухня знаходзіцца ў антысанітарным стане. Усюды маса мух. Нідзе не відна санітарнага нагляду. Наведвальнікам падаюцца замасленыя, нявымытыя і нявыцертыя прыборы.

Можна яшчэ дадаць, што дырэктар зусім не звяртае ўвагі на непарадкі, якія творацца на яго вачах.

Узнікае пытанне: хто павінен заняцца гэтай справай і навесці культурнасць і парадак у савецкім рэстаране?

Ваенурач **П. Жогаль.**

Бестурботнасць скідэльскага раённага аддзела народнай асветы

У Скідэльскім раёне школы не забяспечаны дравамі. Гродненскі леспрамгас, замест дапамогі, тармозіць вывазку дроў з лесу: ён даў нарад на вывазку дроў з участкаў, размешчаных у балотах. З гэтых балот нават у снежні месяцы нельга вывезці дровы, а тым больш у асенняе надвор'е.

Не лепш абстаіць справа і з асвятленнем. У школах няма карасіну, патэтаму вячэрнія школы непісьменных і малапісьменных спынілі вучобу. Яшчэ тыдзень — і немагчыма будзе займацца і тым дзецям, якія навучаюцца на другой змене. З 53 школ раёна электрычнасцю карыстаюцца толькі некаторыя.

Загадчыка райана т. Гукава ўсе гэтыя недахопы зусім не турбуюць. На пытанне аднаго з настаўнікаў, як быць без святла, тав. Гукаў адказаў: «Я-ж не гандлюючая арганізацыя». Тав. Гукаў усіх супакойвае абяцаннямі, а на справе нічога не робіць.

М. Эйгер.
інспектар абласнога аддзела народнай асветы.

ПАПУЛЯРНЫЯ ЛЕКЦЫІ ДЛЯ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ

У верасні Беластоцкі гарком партыі правёў рад папулярных лекцый для рабочых і служачых на прадпрыемствах горада. На 23-й тэкстыльнай фабрыцы лектар тав. Самойліч прачытаў лекцыю: «Шлюб і сям'я ў сацыялістычным грамадстве». Лекцыя выклікала вялікую зацікаўленасць. Яе праслухала 200 чалавек.

На скурзаводзе і 29-й тэкстыльнай фабрыцы лектар тав. Бургін на польскай мове прачытаў лекцыю: «Рэлігія і нацыянальная рознь». На лекцыях тав. Бургіна прысутнічала 439 чалавек.

Аб міжнародным становішчы прачытаны лекцыі на фанерным заводзе, плюшавай фабрыцы і ў «Атэлье мод», у абласным фінансавым аддзеле і ў саюзе мастакоў. Гэтымі лекцыямі ахоплена 850 чалавек.



На здымку: пісьменнік Змітрок Бядуля ў сваім рабочым кабінеце за чытаннем закончанай ім па матывах беларускіх народных казак фантастычнай аповесці для дзяцей «Сярэбраная табакерка».

Фота Б. Хеніна. Фотахроніка БЕЛТА.

Змітрок Бядуля

Да 30-годдзя літаратурнай дзейнасці.

Сёння адзначаецца трыццацігоддзе літаратурнай дзейнасці выдатнага беларускага пісьменніка Змітрака Бядулі.

30 год таму назад у адзінай тады беларускай газеце «Наша ніва» былі надрукаваны невялікія апавяданні маладога пісьменніка Самуіла Плаўніка, які выступіў пад псеўдонімам Змітрака Бядулі.

Змітрок Бядуля нарадзіўся ў 1886 годзе, у беднай яўрэйскай сям'і з мястэчка Пасадзец, былога Вілейскага павета. З маленства ён ведаў гора, галечу, голад. Выхоўваўся ў яўрэйскай талмудысцкай школе і толькі ў пятнаццацігадовым узросце вывучыў рускую мову. Бацька яго, местачковы балагола, не мог пракарміць шматлікую сям'ю, і шаснаццацігадовы Самуіл Плаўнік пачаў вучыць дзяцей грамаце ў сваім родным мястэчку. З трынаццаці год ён піша вершы на стара яўрэйскай мове, з дзевятнаццаці—на рускай, а пазней—па-беларуску. Першыя яго творы на беларускай мове былі надрукаваны ў 1910 годзе. Раннія творы Бядулі, галоўным чынам яго паэзія, маюць значныя сляды рамантызма маладога пісьменніка.

Апавяданні Бядулі, сабраныя потым у зборніку «Абразкі», вылучаліся арыгінальнасцю, вялікай паэтычнасцю.

Адначасова са зборнікам «Абразкі» пісьменнік змяшчае ў «Нашай ніве» вялікую колькасць вершаў. Уласна кажучы, і прозу са зборніка «Абразкі» можна было-б з поўным правам прылічыць да вершаванай творчасці пісьменніка, бо яна рэзка адрозніваецца ад яго наступнай рэалістычнай прозы. У вершах Бядулі пераважала суровая прырода, вельмі часта пісьменнікам выкарыстоўваліся з вялікім мастацкім густам вобразы народнай міфалогіі.

Часамі мы сустракаем у паэта малюнкі вёскі, яе змучанасці, «анямеласці, зачумленай смерці».

Птушкай лезе ўспамін з абяздоленай вёскі.
Там замерлі жыцця галасы, адгалоскі.
Людзі сталі маўклівы, як пні.
Пазадушана ўсё пад цяжарам магілы.
Чорным крыллем бяда нават сонца замгліла.
І прапалі, патухлі агні.

У некаторых вершах гучыць гнеў сэрца паэта:

Начлежнікі пяюць. Кіруйце спеў туды,
Дзе ў сэрцы, у грудзёх так горача і цесна.
Вы знойдзеце шмат слоў, шмат новых — і тады...
У полымя-пажар разгневаецца песня.

У многіх творах прозы Бядуля праўдзіва і пераканаўча паказвае дарэвалюцыйную беларускую вёску, жыццё і быт якой ён ведаў выключна добра. Пісьменнік у навелах раскрывае (вельмі часта і праз юмар) трагічныя бакі дарэвалюцыйнай, убогай, жабрачай, забітай, беларускай вёскі. У апавяданні «Сорам» ён стварае яркі вобраз селяніна-бедняка, даведзенага падаткамі, беззямеллем да жабрацтва, да зладзейства. Ва ўсіх навелах Бядулі вобраз селяніна-бедняка, якога ненавідзіць вясковае начальства, над якім здзекуецца кулацтва, паказан з выключнай яскравасцю. Вось перад намі ў апавяданні «Сорам» стаіць худая, згорбленая постаць бедняка Ігналя, якога кулак Марцін збівае да поўсмерці за ўкрадзены мех сена. Ігналя стаіць, абкружаны тупым роўнадушшам кулакоў, якія рыхтуюцца да самасуду.

Але Бядуля не толькі паказвае цяжкае становішча бядняцкіх мас сялянства — ён стварае і вобразы сялян-бунтароў, якія не хочуць мірыцца са сваім становішчам. Так, у аповесці «Дванаццацігоднікі» Бядуля нарысаваў вобраз селяніна Лявона, які, помсцячы за ўсю вёску, сагнаную памешчыкам з зямлі, падпаліў вялізны панскі маёнтак.

Змітрок Бядуля ў сваёй дакастрычніцкай творчасці ярка выяўляе народнае гора, народныя пакуты. Пісьменнік увабраў у сваю творчасць народны гнеў і смутак.

Творы Бядулі паказваюць тыя велізарныя змены, якія адбыліся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі як у горадзе, так і ў вёсцы, адлюстроўвае рэвалюцыйны энтузіязм працоўных мас у іх змаганні са знешнімі ворагамі і акупантамі і ў мірным будаўніцтве па аднаўленню народнай гаспадаркі. Бядуля-рэаліст праяўляе сваю наглядальнасць і ўвагу да новых з'яў рэчаіснасці. Такімі з'яўляюцца такія творы, як «Беларус», «З сказаў буры і віхуры», «Чырвона-чорная жалоба», «Чырвоны каляндар».

Перамога Бядулі-рэаліста азначала пераход пісьменніка да тэматыкі з жыцця маладой савецкай краіны.

Рэвалюцыйная барацьба рабочых і сялян супроць сваіх прыгнятальнікаў, супроць нямецкіх і белапольскіх акупантаў займае вялікае месца ў творчасці Змітрака Бядулі. У апавяданні «На балоце» ён паказвае змаганне сялян-партызан супроць белапольскіх акупантаў, паказвае расправу сялян над правакатарам Бавельчыкам. Вельмі тонка і з вялікім майстэрствам стварае пісьменнік у гэтых апавяданнях карціны беларускага пейзажа — суровых лясоў, што хаваюць партызан ад ворагаў, непраходных балот, сцежкі якіх вядомы толькі палешукам.

Разгром панскага маёнтка, дзе жыве «панскі дух», паказан у апавяданні той-жа назвы.

Сацыялістычны рэалізм Змітрака Бядулі асабліва ярка выявіўся ў яго апошніх кнігах, якія з'яўляюцца перамогай усёй беларускай савецкай літаратуры.

У 1927 годзе Бядуля піша раман «Салавей». У цэнтры рамана аб прыгонным праве на Беларусі — Сымон, вясковы хлапец, які пераймае галасы і гукі ўсёй жывой прыроды, які пяе салаўём.

«Хлопчыка апанавалі колеры і гукі, — піша З. Бядуля, — усімі пачуццямі ўбіраў ён у сваю істоту вакольнае. Увесь свет быў як у гняздзе ў яго сэрцы для яго».

Калі спявае Сымон-Салавей:

«Тады здаецца, што зоркі падаюць у хмызнях і звіняць серабром і шклом. Тады здаецца, што салаўіная песня застывае на лузе кроплямі расы, дыяментамі радасных слёз».

Бядулі ўдалося ў «Салаўі» паказаць старонкі жудаснага ўціску сялянства панамі ў прыгонную эпоху на Беларусі. Бядуля ярка паказаў, як памешчыкі эксплаатавалі не толькі фізічныя, але і духоўныя, творчыя сілы народа. Гэты паказ ставіць раман у рады лепшых твораў беларускай літаратуры.

Услед за «Салаўём» з'явіўся вялікі двухтомны раман «Язэп Крушынскі».

За 30 год творчай работы Змітраком Бядуляй напісана вялікая колькасць празаічных і паэтычных твораў, многія з якіх з'яўляюцца гордасцю беларускай савецкай літаратуры. За апошнія годы ён няўтомна працуе над новымі творамі. Ім напісана п'еса «Салавей», кінасцэнарый па раману «Салавей», а таксама аповесць «Набліжэнне». Гэта аповесць аўтабіяграфічная. Яна расказвае пра пакуты юнага інтэлігента-рамантыка ў невялікім яўрэйскім мястэчку старой Беларусі, пра пакуты людзей, скаваных «чертой оседлости», галечай, казацкімі налётамі і грабяжамі, пра зямлю і дарогі, дзе адбывалася вялікая імперыялістычная бойня, пра зямлю і дарогі, якія акупанты залілі крывёй народа.

Гэтая невялікая аповесць па замыслу аўтара павінна з'явіцца часткаю вялікай аўтабіяграфічнай трылогіі.

Апошнімі творамі Бядулі з'яўляюцца аповесці — «У дрымучых лясах», «Сярэбраная табакерка», а таксама паэма «Хлопчык з-пад Гродна».

Вялікая працаздольнасць, безупынная работа над новымі і новымі творамі гаворыць аб невычарпаных творчых здольнасцях Змітрака Бядулі.

За выдатныя заслугі і дасягненні ў справе развіцця савецкай мастацкай літаратуры ўрад СССР узнагародзіў З. Бядулю ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

А. Кучар.

АНГЛА-ГЕРМАНСКАЯ ВАЙНА

ГЕРМАНСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

БЕРЛІН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне германскай арміі паведамляе: «Не гледзячы на неспрыяючыя ўмовы надвор'я, учора працягваліся аперацыі супроць Лондана і важных ваенных аб'ектаў Паўднёвай і Сярэдняй Англіі. На адным з газавых заводаў у паўночна-заходняй частцы Лондана ўзнік вялікі пажар. Асабліва паспяховы налёт зроблен на два ваенных заводы ў Ковентры, каля Чэсцера. На абодвух заводах знішчаны зборачныя базы і машыны. Паспяховай бамбардыроўцы падвергліся таксама розныя аэрадромы ў гарадской чарце Лондана і аэрадром Сент Эваль у графстве Корнуол, дзе разбураны ангары, пасадачныя пляцоўкі і самалёты. Эфектыўнай была і бамбардыроўка аэрадрома ў Шорнесе. Паўночней Лондана асобныя германскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёты на чыгуначныя саставы і калоны грузавых машын.

Непрыяцельская авіяцыя праяўляла ўчора слабую актыўнасць. Толькі адзін самалёт праціўніка зрабіў напад на прамысловыя прадпрыемствы Заходняй Германіі і некалькі самалётаў—на ўзбярэжжы Нарвегіі. Урон нязначны. Непрыяцель страціў за ўчарашні дзень тры самалёты, германская авіяцыя — чатыры.

БЕРЛІН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае германскае інфармацыйнае бюро, 100 германскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі ўчора новы налёт на Лондан, скінуўшы 150 тысяч кілаграмаў бомб розных калібраў. Апошнія звенні самалётаў наглядалі ў розных пунктах Лондана моцныя разбурэнні і вялікія пажары.

АНГЛІЙСКІЯ ПАВЕДАМЛЕННІ

ЛОНДАН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе міністэрства авіяцыі, англійскія бамбардыроўшчыкі прадпрынялі ў ноч на 3 кастрычніка паспяховыя аперацыі супроць ваенных аб'ектаў Германіі і акупіраваных ёю краін. Над большай часткай гэтых раёнаў была нізкая воблачнасць, якая надзвычайна затрудняла дзеянні англійскай авіяцыі. Самалёты неаднаразова падвяргаліся абледзяненню.

Асноўная аперацыя англійскай авіяцыі была накіравана супроць Гамбурга, дзе на працягу двух гадзін інтэнсіўнай бамбардыроўцы падвергліся нафтазавод і нафтасховішчы.

На ўсіх аб'ектах адзначаны ўзрывы і моцныя пажары.

Другія атрады англійскіх бамбардыроўшчыкаў зрабілі налёты на докі і гавані Германіі і акупіраванай немцамі тэрыторыі. Бамбардыроўцы падвергліся Вільгельмсгафен, Штэцін, Амстэрдам, Ротэрдам, Антверпен, Флісінген, Остэндэ і Эмдэн.

У час гэтых аперацый былі скінуты бомбы на 13 аэрадромаў Германіі і акупіраваных ёю тэрыторый.

Германскія самалёты скінулі бомбы ў радзе раёнаў Лондана, дзе пашкоджана некалькі будынкаў. Ахвяры нязначныя.

У іншых раёнах Англіі бамбардыроўцы падвергліся асобныя пункты ў даліне ракі Тэмзы, а таксама ў графствах Эсекс, Кент і Корнуэл. Па маючыхся звестках разбурэнні не носяць сур'ёзнага характару. У адным з гарадоў Цэнтральнай Англіі ёсць забітыя і раненыя, у другім горадзе разбурана многа дамоў.

У ноч на 4 кастрычніка аперацыі германскай авіяцыі ахапілі 31 раён Англіі.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АНГЛІЙСКАГА ВАЕННАГА МІНІСТЭРСТВА

ЛОНДАН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае, што «як указваецца ў камюніке марскога міністэрства, за апошнія некалькі тыдняў англійскія ваенна-марскія і ваенна-паветраныя сілы знішчылі 7 германскіх і 2 італьянскіх падводных лодкі». Далей у камюніке ўказваецца, што «за апошні час праціўнік дабіўся большых поспехаў у сваёй падводнай вайне супроць гандлёвага флота, чым на першым этапе вайны. Пасля паражэння Францыі і захвату немцамі французскіх портаў на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяна гэта ні ў якім разе не з'яўляецца нечаканасцю. Падводныя лодкі, якія аперыруюць з гэтых портаў, могуць знаходзіцца ў плаванні значна больш, чым тады, калі яны аперыравалі з германскіх баз». Далей агенцтва ўказвае, што «англійскі флот і авіяцыя прычынілі праціўніку страты. Аднак марское міністэрства заўсёды прытрымлівалася таго пункту погляду, што было-б немэтазгодным неадкладна аб'яўляць аб патапленні падводных лодак праціўніка, бо падобныя заявы прадстаўлялі-б аператыўную каштоўнасць для праціўніка».

„Журналь" аб магчымасцях германскага ўварвання ў Англію

ВІШЫ, 4 кастрычніка. (ТАСС). Ваенны аглядальнік французскай газеты «Журналь» генерал Дуваль ставіць пытанне: калі Германіі не ўдасца дабіцца капітуляцыі Англіі шляхам бамбардыровак, ці не паспрабуе яна высадзіць дэсант, не гледзячы на дрэннае надвор'е? Не гледзячы на велізарную дзейнасць бамбардыровак Лондана і Берліна, піша Дуваль, відаць, гэты новы метад барацьбы не зможа ўсё-ж прывесці да капітуляцыі аднаго з праціўнікаў. Можна думаць, што наступленне восені павінна аддаліць магчымасць уварвання з мора. Аднак, па маючыхся ў Англіі звестках, Германія працягвае актыўна падрыхтоўваць у портах французскага ўзбярэжжа дэсантную аперацыю.

Газета «Фігаро» паведамляе, што за адзін тыдзень, з 17 па 24 верасня, англійская авіяцыя зрабіла 48 налётаў на порты Ла-Манш.

Забарона „Дэйлі уоркер" у Паўночнай Ірландыі

ЛОНДАН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Англійскае міністэрства інфармацыі забараніла распаўсюджванне англійскай комуністычнай газеты «Дэйлі уоркер» у Паўночнай Ірландыі.

КАМЮНІКЕ

АБ ПАДПІСАННІ ПАГАДНЕННЯ АБ ЧЫГУНАЧНЫХ ЗНОСІНАХ ПАМІЖ СССР І ГЕРМАНІЯЙ.

1 кастрычніка гэтага года ў горадзе Берліне адбылося падпісанне Пагаднення аб чыгуначных зносінах паміж СССР і Германіяй. Пагадненне прадугледжвае прамы пасажырскі і грузавы рух паміж СССР і Германіяй.

Перагаворы працякалі ў добразычлівай атмасферы.

З совецкага боку Пагадненне падпісаў па ўпаўнаважанню Народнага Камісара Шляхоў Зносін Саюза ССР тав. **Нізоўцаў Е. І.**, з германскага боку—старшыня праўлення германскіх чыгуначных дарог п. **Гольц**.

—o—

У АПОШНЮЮ ГАДЗІНУ

УРУЧЭННЕ ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ ПАЎПРЭДАМ СССР У ТУРЦЫІ

АНКАРА, 4 кастрычніка. (ТАСС). Анаталійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што «прэзідэнт рэспублікі Ісмет Іненю прыняў учора новага пасла СССР у Анкары Вінаградава, які ўручыў свае вярыцельныя граматы. Пры гэтым прысутнічаў міністр замежных спраў Сараджоглу. У час цэрамоніі быў выстаўлен пачотны каравул.

—o—

СУСТРЭЧА ГІТЛЕРА З МУСАЛІНІ.

БЕРЛІН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае афіцыяльнае паведамленне аб тым, што сёння ў 11 гадзін раніцы ў Брэнеры Гітлер сустрэўся з Мусаліні і меў з ім працяглую гутарку. Спецыяльны поезд Гітлера прыбыў у 11 гадзін на пагранічны італьянскі вакзал Брэнера. Вакзал быў упрыгожан італьянскімі і германскімі сцягамі. Далей германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што перагаворы адбываліся ў салон-вагоне Мусаліні ў прысутнасці міністраў замежных спраў абодвух краін.

Гітлера суправаджалі кіраўнік вярхоўнага камандавання ўзброенымі сіламі Германіі генерал-фельдмаршал Кейтэль, кіраўнік аддзела друку германскага ўрада Дзітрых і іншыя. Германскі пасол у Рыме Мекензен суправаджаў Мусаліні ў яго паездцы ў Брэнер.

БЕРЛІН, 4 кастрычніка. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро перадае з Брэнера, што пасля заканчэння перагавораў Гітлер пакінуў у 14 гадзін 30 мінут Брэнер.

—o—

ВАЕННЫЯ ПАДРЫХТАВАННІ У ЗША

НЬЮ-ЁРК, 4 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню вашынгтонскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, ваенны міністр ЗША Стымсон аб'явіў аб стварэнні першага батальёна парашутыстаў у саставе 500 чалавек у Форт-Бенінгу (штат Георгія). Адначасова Стымсон заявіў, што ваеннае міністэрства заказала авіяцыйнай кампаніі «Дутлас Эйркфарт» самалёты на суму ў 141 млн. далараў.

На мінулым тыдні Стымсон заявіў, што з 1 ліпеня бягучага года ваеннае міністэрства размясціла заказы звыш чым на 13 тыс. самалётаў.

—o—

НОВЫЯ АСІГНАВАННІ НА ВАЕННЫЯ ПАТРЭБЫ У ЗША

НЬЮ-ЁРК, 4 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Вашынгтона, амерыканскі кангрэс канчаткова адобрыў законапраект, які прадугледжвае дадатковыя асігнаванні на ваенныя патрэбы ў размеры 1.482 млн. далараў.

Максім ТАНК

Спекулянт

Да прыходу арміі Чырвонай
Быў ён у мястэчку гандляром.
За працэнты плыўшыя штодзённа
Ў яго вырас мураваны дом.

Жонка ў футры дарагой хадзіла,
А сын з палкай—карпарант-эндэк;
Дачка вачэй з шпораў не зводзіла,
І ён сам быў «ціхі» чалавек:

Дружыў з «шпіцлем», з маткай чэнстахоўскай.
Ды з усімі, хто памог яму
Зарабіць, або урваць хоць трошкі
І папоўніць золатам суму.

Марыў ён стаць фабрыкантам ў Лодзі
Ці ў Варшаве засядаць паслом.
Але што-ж, калі ў мінулым годзе
Усім такім, як ён, не павязло.

Хоць ты вый ці уцякай лісіцай
З чамаданамі, з пярынамі, з сям'ёй.
Толькі як, куды? —калі граніцу
Спераґуць байцы з чырвонаю звяздой.

Дык хутчэй злосць затаіўшы, воўча
Змяніў скуру, стаў зусім другім.
Паглядзіш—«патомственны рабочы»,
Бруха ўціснуў поясам тугім.

І глыбей старацца пралезці
Ў спакайнейшы, цёпленькі куток.
І дачушка вынюхала месца,
Ў шчэль клапом праціснуўся сынок.

І арудуюць, як толькі могуць:
Там шапнуць, там тысячу урвуць.
У «Заготжывёле» ледзь запішуць рогі,
А быка, дык з скурай прададуць.

З кааператыва пад палой на рынак
Вынесе тавараў шмат.
І таўсцее тэткая скаціна,
Смокча сокі п'яўка-спекулянт.

Трэба ўмець іх пазнаваць. Пазнаўшы —
Як смяццё з жыцця іх вымятаць.
Да совецкай гаспадаркі нашай
На гарматны стрэл не дапускаць!

Беласток. 1940 г.

—o—

Аркестры і хоры— да гадавіны Кастрычніка

Музыкальныя і харавыя калектывы мастацкай самадзейнасці Беластоцкай області дзейна рыхтуюцца да святкавання 23-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай Рэвалюцыі. Вывучаюцца новыя творы і лепшыя песні совецкіх кампазітараў.

Вядомы хор абласнога Дома народнай творчасці пад кіраўніцтвам тав. Шнеура рыхтуе да свята «Песню аб Сталіне» армянскага кампазітара Арама Хачатурана. Гэта песня будзе выканана ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра беластоцкай філармоніі. Акрамя таго калектыў Шнеура падрыхтоўвае хоры з оперы «Кветка шчасця» беларускага кампазітара дэпутата Вярхоўнага Совета БССР А. Е. Туранкова.

Адначасова сваю дзейнасць гродненскі гарадскі хор мастацкай самадзейнасці пад кіраўніцтвам тав. Вігдаровіча. Гэты калектыў будзе працаваць як хор яўрэйскай народнай песні.

Дзейна рыхтуецца да ўдзелу ў святочных урачыстасцях скідэльскі раённы хор беларускай народнай песні.

«УШЧЫЛЬНЕННЕ» РАБОЧАГА ДНЯ.



— Мне-б водпуск атрымаць ды адпачыць...
— А я, вось, адпачываю без адрыву ад вытворчасці.
Рыс. Леўчэнка. Фота-кліша ТАСС.

Год таму назад

(Хроніка падзей)

5-га кастрычніка. У цэнтры ўвагі ўсяго палітычнага жыцця горада і вёскі — пытанне аб прадстаячым скліканні Народнага Сабрання. На прадпрыемствах і ў вёсках адбываюцца многалюдныя мітынгі і сходы. На прадпрыемствах Беластока прынята пісьмо таварышам Сталіну, Молатаву, Калініну і Варашылаву. У гэтым пісьме гаворыцца:

«Панская Польшча была злой мачыхай для нацыянальных меншасцей, яна ніколі не была бацькаўшчынай і для польскіх працоўных. Толькі Сталінская Канстытуцыя забяспечыць нам права на працу, права на асвету, права на адпачынак... Мы пашлем дэпутатамі ў Народнае Сабранне лепшых людзей народа, такіх, якія-б абаранялі інтарэсы народа, былі-б сапраўднымі слугамі працоўных».

На радзе прадпрыемстваў рабочыя прынялі рашэнне пасылаць сваіх прадстаўнікоў у вёску для аказання дапамогі ў падрыхтоўцы к Народнаму Сабранню.

Адбыўся агульны сход тэкстыльшчыкаў Беластока, на якім з яркай прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Панамарэнка. Тэкстыльшчыкі звярнуліся з пісьмом да ўсіх рабочых, работнікаў, сялян і сялянак, да інтэлігенцыі Заходняй Беларусі. У пісьме гаворыцца:

«Мы, пролетарыі Беластока, заклікаем вас усіх, хто не хоча беспрацоўя, голаду і галечы, хто не хоча звярнуць зямлю памешчыкам, хто не хоча звароту нацыянальнай розні, нацыянальнага гнёту і паліцэйскіх палак, хто хоча бачыць шчаслівымі сваіх дзяцей — заклікаем дабівацца ўстанаўлення совецкай улады ў Заходняй Беларусі».

Тэкстыльшчыкі высоўваюць асноўныя патрабаванні перад Народным Сабраннем: 1) рашыць пытанне аб устанаўленні совецкай улады ў вызваленых абласцях; 2) рашыць пытанне аб з'еднанні аднакроўных братоў, аб уваходжанні Заходняй Беларусі ў састаў БССР; 3) адобрыць праведзены сялянамі раздзел памешчыцкай зямлі; 4) нацыяналізаваць банкі і буйную прамысловасць.

К гэтаму часу працоўныя ўжо адчулі рэальныя плады работы Часовых упраўленняў. Прыкметна пачало скарачацца беспрацоўе. Фабрыкі запрацавалі поўным ходам. Але гэтыя фабрыкі яшчэ знаходзіліся ў руках капіталістаў. Рабочы кантроль узмацняе сваю дзейнасць, пільна сочыць за махінацыямі фабрыкантаў, якія ўжо адчулі набліжэнне канца свайму гаспадаранню.

Дапамога юным кампазітарам

Пры саюзе кампазітараў БССР арганізаваны курсы творчай дапамогі для пачынаючых самадзейных кампазітараў.

Беластоцкі Дом народнай творчасці прыступіў ужо да выяўлення лепшых таленавітых самадзейных кампазітараў, каб у будучым накіраваць іх на вучобу. Сярод атрыманых Домам народнай творчасці кампазіцый заслугоўвае ўвагу вальс «Жыццё лётчыка», напісаны 16-гадовым сынам чыгуначніка Юрыем Прылуцкім. Гэты твор сведчыць аб несумненных здольнасцях маладога кампазітара.

КЛОПАТЫ АБ ІНВАЛІДАХ І ПРАСТАРЭЛЫХ

Гродненскі гарадскі аддзел сацыяльнага забеспячэння праводзіць вялікую работу па аказанню дапамогі інвалідам працы і прастарэлым.

Зараз па гораду 250 чалавек атрымліваюць пенсію па непрацаздольнасці. Кожны месяц ад дзяржавы яны атрымліваюць 17 тысяч рублёў. Акрамя таго, 100 чалавек, страціўшых часткова працаздольнасць, атрымалі работу.

Арганізавана арцель сляпых па вырабу вяровак. З кожным днём гэтыя людзі ўсё лепш авалодваюць сваім рамяством і паказваюць прыклады работы.

У горадзе ёсць тры дамы для прастарэлых, у якіх налічваецца 250 чалавек. Прастарэлыя акружаны клопатамі і ўвагай.

„Аб маральным абліччы совецкага пісьменніка"

Сёння ў 8 гадзін вечара ў беластоцкім Доме пісьменніка адбудзецца адкрыты сход пісьменнікаў з удзелам мастакоў, настаўнікаў, студэнтаў і іншых прадстаўнікоў працоўнай інтэлігенцыі.

На сходзе з дакладам на тэму «Аб маральным абліччы совецкага пісьменніка» выступіць дэпутат Вярхоўнага Совета СССР паэт тав. Пестрак.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

УБ—59. Друкарня Беластокдрук